# Свабодны Салігорск

Незалежная газета Салігорска

Выдаецца з верасьня 2006 г. пры інфармацыйнай падтрымцы Салігорскага Маладога Фронта ды сайта **saligorsk.org** **№12**


## "Малады фронт" падаў у суд на ўпраўленьне юстыцыі

Управа "Маладога фронту" падала пазоў у суд гораду Менску супраць упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму з патрабаваньнем прытрымліваца закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях і зарэгістраваць "Малады фронт".

**Старонка 2**

## Купацца ў Салігорскім вадасховішчы па ранейшаму нельга

У Менскай вобласьці ў «чорны сьпіс» патрапілі 15 вадаёмаў. Гэта рака Цітаўка Пухавіцкага раёна, рака Случ Слуцкага раёна і ў гарадзкім пасёлку Старобін Салігорскага раёна . . .

**Старонка 2**

## Салігорск пашырае свае межы

Пэрспэктыўная забудова беларускай сталіцы шахтароў, разьлічаная на бліжэйшыя гады, будзе весьціся ў раёне ад вуліцы Моладзевай да аўтамагістралі Менск — Мікашэвічы.

**Старонка 3**

## Беларуская калійная кампанія павялічыла экспарт на 47%

Беларуская калійная кампанія» (БКК) – эксклюзіўны пастаўшчык калійных угнаеньняў РУП ВА «Беларуськалій» на замежныя рынкі і вядучы сусьветны экспарцёр гэтай прадукцыі, падвяла вынікі сваёй дзейнасьці за першае паўтодзьдзе 2007 года.

**Старонка 3**

## Як забараняюць пікеты пратэсту ў Салігосрку

Салігорскі райвыканкам вызначыў для мітынгаў і пікетаў адзінае месца. Але тамака практычна нічога правесьці немагчыма – тэрыторыя занятая.

**Старонка 4**

## АБСЭ назвала Беларусь адным з найбольш жорсткіх цэнзараў у Інтэрнэце

У адмысловай справаздачы АБСЭ, агучанай у пятніцу ў Вене, выказваецца заклапочанасьць у зьвязку з ростам дзяржаўнага кантролю над Інтэрнэтам.

**Старонка 5**

## "Малады фронт" пад крымінальным перасьледам

Дванаццатую па ліку крымінальную справу за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі перадалі днямі ў суд. Дзевяць з дванаццаці крымінальных спраў улады распачалі супраць актывістаў "Маладога фронту". Шэсьць чалавек судзілі. Лідэра арганізацыі Зьмітра Дашкевіча пакаралі зьняволеньнем на паўтара года, а пяцёх актывістаў – штрафамі. У верасьні пачнуцца суды ў Салігорску, Баранавічах і Нясьвіжы.

Актывісты незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" Іван Шыла, Наста Азарка і Яраслаў Грышчэня ў хуткім часе паўстануць перад судом. Іх абвінавачваюць ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". Маладафронтаўцы лічаць, што спроба ўладаў зьнішчыць арганізацыю і запалохаць прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў сярод моладзі выклікала адваротную рэакцыю.

**Старонка 7**

# Абаронім моладзь разам!




Нас вельмі непакоіць той факт, што ў нашай краіне працягваецца неаб'яўленая вайна супраць моладдзі — самых актыўных прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў, адважных змагароў за нацыянальнае адраджэнне.

За акрэсленную грамадскую пазіцыю і ўдзел у акцыях салідарнасці юнакоў кожны тыдзень затрымліваюць, цягаюць па пастарунках, судзяць па сфальсіфікаваных пратаколах за «нецэнзурную лаянку» або дробнае хуліганства.

Самых светлых, адукаваных і таленавітых юнакоў і дзяўчат выключаюць з універсітэтаў, падвяргаюць вобшукам, кідаюць у турмы. Супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі ўрываюцца ў прыватныя кватэры, робяць вобшукі. . .

**Старонка 2**

# Абаронім моладзь разам!

Нас вельмі непакоіць той факт, што ў нашай краіне працягваецца неаб'яўленая вайна супраць моладзі — самых актыўных прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў, адважных змагароў за нацыянальнае адраджэнне.
За акрэсленную грамадскую пазіцыю і ўдзел у акцыях салідарнасці юнакоў кожны тыдзень затрымліваюць, цягаюць па пастарунках, судзяць па сфальсіфікаваных пратаколах за «нецэнзурную лаянку» або дробнае хуліганства.
Самых светлых, адукаваных і таленавітых юнакоў і дзяўчат выключаюць з універсітэтаў, падвяргаюць вобшукам, кідаюць у турмы.
Супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі ўрываюцца ў прыватныя кватэры, робяць вобшукі, пераследуюць на вуліцы, праслухоўваюць тэлефонныя размовы, дапытваюць моладзь у навучальных установах, аказваюць псіхалагічны ціск, пераследуюць бацькоў актывістаў і звальняюць іх з працы.
За масавыя акцыі з нацыянальнымі сцягамі, нашэнне нацыянальнай сімволікі, імкненне размаўляць на роднай мове моладзь пераследуюць і караюць па месцы навучання, не дапускаюць да іспытаў, выганяюць з інтэрнатаў.
Моладзевыя лідэры **Зміцер Дашкевіч**, **Артур Фінькевіч** знаходзяцца ў зняволенні. Рэжым пераследуе нават непаўнагадовых, сярод якіх **Наста Палажанка** і **Іван Шыла**. На працягу мінулых тыдняў ў Менску былі арыштаваныя 15 юнакоў.
На 15, 10 і 7 сутак зняволення на Акрэсціна асуджаны — **Аляксей Шыдлоўскі, Аляксандр Чарнышоў, Валянцін Сакалоўскі, Уладзімір Сяргееў, Кірыл Мацкевіч, Сяргей Клюеў**.
Зноў за кратамі апнуліся **Павал Севярынец, Аляксей Шэін, Зміцер Хведарук.**
Моладзевым арганізацыям **«Малады Фронт»** і **«Маладая грамада»** адмоўлена ў рэгістрацыі.
КДБ робіць новы напад на «Малады фронт». У суд перададзена справа салігорскага маладафронтаўца **Івана Шылы.** Івану — 16 гадоў, ён з'яўляецца вучнем сярэдняй школы. У мінулым годдзе ён разам з сябрамі прымаў удзел у галадоўцы пратэсту.
Паўторная крымінальная справа заведзена на **Анастасію Азарку**, Нясвіжскую актывістку. Дзяўчына, якая скончыла педагагічны каледж, любіць беларускую мову, літаратуру, захапляецца паэзіяй, не можа ўладкавацца на працу. Ёй прыходзіцца перабівацца на часовых заробках. Яе ўвесь час трымаюць пад кантролем органы міліцыі, ходзяць за ёй следам, прыцягваюць да адказнасці, як толькі ў горадзе з'яўляюцца ўлёткі апазіцыйнага характару. Дома ў Насты некалькі разоў адбывалісяператрусы. Зараз Наста зноў знаходзіцца пад крымінальнай справай. Анастасся Азарка ў «Маладым Фронце» ужо 10 год. Яе дзядуля з бабуляй сядзелі ў сталінскіх лагерах і там пазнаёміліся з беларускімі патрыётамі. Наста ўдзельнічала ў шматлікіх акцыях, дапамагала ў падрыхтоўцы выдання кнігі П. Севярынца «Нацыянальная ідэя».
Пад крымінальнай справай знаходзіцца Баранавіцкі актывіст «Маладога Фронту « 18-гадовы **Яраслаў Грышчэня**. Пасля заканчэння базавай школы ён займаўся ў будаўнічым вучылішчы.
Далучыўся да актыўнай дзейнасці «Маладога фронту», на працягу 4 гадоў браў удзел у працы Баранавіцкай філіі моладзевай арганізацыі. Быў на Майдане ў час украінскіх выбарах у 2004 годдзе. За гэта быў выключаны з навучальнай установы, перавёўся ў мастацка-рэстаўрацыйнае вучылішча.
Прымаў удзел у выбарчай кампаніі і намётавым мястэчку ў 2006 годдзе, пасля гэтага быў зноў выключаны з вучобы. У 2007 годдзе на рашучага і моцнага маладафронтаўца заведзена крымінальная справа.У лютым пасля ператруса на кватэры актывіста ў яго быў канфіскаваны кампутар.
Хлопцы і дзяўчаты не могуць спакойна сядзець дома пакуль дыктатура вядзе наступ на правы грамадзян. Яны ладзяць акцыі пратэсту, развешваюць сцягі і партрэты палітвязняў, наносяць палітычныя графіці, рызыкуючы страціць вучобу і працу.
Мы заклікаем усіх свядомых грамадзян падняцца ў абарону моладзі, якая ідзе ў авангардзе змагання.
Мы патрабуем спыніць пераслед грамадскі актыўнай моладзі!

**Не — новым судам над маладафронтаўцамі!**

**Не — расправам над непаўнагадовымі юнакамі!**

**Не —пераследу маладых патрыётак!**

***Мілінкевіч А. У.палітык***
***Вячорка В.Р. палітык***
***Статкевіч М. В. палітык.***
***Содаль У. І. літаратуразнаўца***
***Барадулін Р.І. народны паэт Беларусі,***
***Якавенка В. Ц. пісьменнік.***
***Скрабец С.М. былы палітвязень***
***Сабіла Э.К. былы рэпрэсаваны пастар***
***Дранчук Ц.В. былы палітвязень.***
***Каспяровіч З.А. былы палітвязень***
***Браніцкая Э. В. былая палітзняволеная***
***Кулей І.Ф. грамадскі дзеяч***
***Міхалевіч А.А. палітык***
***Мазынскі В.Я. рэжысер,***
***.Ваніна Т. журналістка***
***Севярынец Т.Я. маці палітзняволенага***
***Гарэцкая Э.І маці рэпрэсаванага***
***Кароль А.П. маці рэпрэсаванага***

## "Малады фронт" падаў у суд на ўпраўленьне юстыцыі




Управа "Маладога фронту" падала пазоў у суд гораду Менску супраць упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму з патрабаваньнем прытрымліваецца закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях і зарэгістраваць "Малады фронт". Пра гэта гаворыцца ў паведамленьні для прэсы незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт".
Тым самым маладафронтаўцы працягваюць заставацца на стадыі рэгістрацыі і могуць на законных падставах выступаць ад імя руху.
У прэсавым рэлізе таксама гаворыцца: "Чакаецца, што судовае паседжаньне, на якім чыноўнікам прыйдзецца растлумачыць суду, чаму правядзеньне масавых акцыяў згодна з заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах, на іх погляд, зьяўляецца парушэньнем у статуце, адбудзецца ў верасьні".

## Купацца ў Салігорскім вадасховішчы па ранейшаму нельга

У Менскай вобласьці ў «чорны сьпіс» патрапілі 15 вадаёмаў. Гэта рака Цітаўка Пухавіцкага раёна, рака Случ Слуцкага раёна і ў гарадзкім пасёлку Старобін Салігорскага раёна, Войкоўскае вадасховішча гарадзкога пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна, Салігорскае вадасховішча, рэкі ІІия і Уша Маладзечанскага раёна, сажалкі вёскі Будзенічы і вёскі Шчыткавічы Старадароскага раёна, возера і сажалка ў рысе горада Любань, Пэтрывіцкае і Чарніцкае вадасховішчы Смалявіцкага раёна, вадасховішча вёскі Гардына Валожынскага раёна, Краснаслабодскае вадасховішча вёскі Смолічы Капыльскага раёна. У Менску забароненыя для купаньня тры вадаёма: вадасховішчы "Заслаўскае" і "Дразды", "Камсамольскае возера".

**Пераклад з расейскай saligorsk.org**

# Беларуская калійная кампанія павялічыла экспарт на 47%

Беларуская калійная кампанія» (БКК) – эксклюзіўны пастаўшчык калійных угнаеньняў РУП ВА «Беларуськалій» на замежныя рынкі і вядучы сусьветны экспарцёр гэтай прадукцыі, падвяла вынікі сваёй дзейнасьці за першае паўтодзьдзе 2007 года. У студзені-чэрвені 2007 года БКК паставіла на замежныя рынкі больш 5 млн. тон калійных угнаеньняў, што на 47% больш чым за аналягічны пэрыяд мінулага года. У прыватнасьці, было прададзена 3,6 млн. тон угнаеньняў вытворчасьці РУП "ВА «Беларуськалій» (на 53% больш) і 1,4 млн. тон (з улікам паставак каардынаваных БКК па ЧД у Кітай – 2,2 млн. тон) – вытворчасьці ААТ «Уралкалій» (на 41% больш), пры гэтым экспартная выручка ад продажаў угнаеньняў абодвух вытворцаў на рынках збыту склала 0,9 млрд. даляраў, перавысіўшы паказчыкі мінулага года на 61%. З пачатку года кампанія істотна ўмацавала свае лідуючыя пазыцыі на сусьветных рынках і дабілася значных посьпехаў у падвышэньні кошту на прадукцыю сваіх акцыянэраў

Учэрвені 2007 БКК дамовілася з найбуйным індыйскім імпарцёрам – кампаніяй IPL аб усталяваньні новага коштавага ўзроўня на прадукцыю сваіх акцыянэраў, рост склаў 50 даляраў за тону.

З лютага 2007 года, пасьля падпісаньня кантрактаў з кампаніямі Sinochem і CNAMPGC, кошт для кітайскага рынку павялічаны на 5 даляраў за тону, што стала другім падвышэньнем кошту на гэтым найбуйным сусьветным рынку менш за за 7 месяцаў – у ліпені 2006 года кошт быў павышаны на 25 даляраў за тону.

Для бразыльскага рынку кошт у пэрыяд з студзеня па жнівень 2007 г. быў ў цэлым павялічаны на 100 даляраў, пры гэтым з 1 кастрычніка 2007 года кошт на калійныя ўгнаеньні, якія пастаўляюцца ў Бразылію, будзе павялічаная яшчэ на 25 даляраў і складзе 305 і 315 даляраў для буйных і невялікіх імпарцёраў адпаведна.

Значныя посьпехі кампаніі на найбуйных міжнародных рынках, дазволілі БКК ужо ў канцы першага паўтодзьдзя 2007 года пераадолець псыхалягічны коштавы бар'ер у 300 даляраў за тону на шэрагу рынкаў Паўднёваўсходняй Азіі, дзе рост склаў каля 50%.

Зачыненае акцыянэрнае таварыства «Беларуская калійная кампанія» было заснаванае ў красавіку 2005 года. Яго заснавальнікамі зьяўляюцца Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Вытворчае аб'яднаньне „Беларуськалій“ (Рэспубліка Беларусь) і Адчыненае акцыянэрнае таварыства „Уралкалій“ (Расійская Фэдэрацыя), якім прыналежыць па 50 адсоткаў акцый кампаніі "Беларуская калійная кампанія" ажыцьцяўляе пастаўкі калійных угнаеньняў у краіны Еўропы, Усходняй Азіі, Міжземнамор'я, Паўднёвай і Паўночнай Амэрыкі, у Паўднёвую Афрыку, Кітай, Індыю – агулам больш за 60 краін сьвету. Дзель «Беларускай калійнай кампаніі» у міжнародным гандлі калійнымі ўгнаеньнямі складае каля 35%. Пастаўляюцца такія віды прадукцыі, як калій хлёрысты стандартны (ружовы, белы), калій хлёрысты грануляваны (ружовы, белы), калій хлёрысты тэхнічны.

**Пераклад з расейскай saligorsk.org**

## САЛІГОРСКАЕ ДАІ АДРЭМАНТУЕ ПРАШПЭКТ МІРУ

Салігорскі райвыканкамам вынайшаў спосаб атрымаць грошы на завяршэньне рамонту прашпэкту Міру. Па распараджэньні кіраўніцтва гораду усе штрафы выдадзеныя супрацоўнікамі Салігорскага ДАІ будуць пералічвацца на рахунак гарвыканкаму. Дзеля гэтага нават распрацаваныя адмысловыя блянкі пратаколаў правапарушэньняў. Акрамя таго кіраўніцтву Салігорскага ДАІ даведзены плян па штрафах, які неабходна выканаць дзеля заканчэньня рамонту. Для шараговых даішнікаў невыкананьне пляну наўпроставым чынам адаб'ецца на заробку, прэміяльных і дысцыплінарых спагнаньнях.

Законнасьць такой зьявы выклікае вялікае пытаньне і напэўна ў "сьветлыя" часы адказныя за такія распараджэньні будуць несьці адказнасьць. Цяпер жа можна адно толькі параіць усім аўтааматарам салігоршчыны быць яшчэ больш пільнымі і ўсяляк пазьбягаць сустрэч з супрацоўнікамі ДАІ, бо дзеля выкананьня пляну штрафы, напэўна, будуць ляпіцца на роўным месцы і памеры іх будуць максымальнымі.

## Салігорск пашырае свае межы

Пэрспэктыўная забудова беларускай сталіцы шахтароў, разьлічаная на бліжэйшыя гады, будзе весьціся ў раёне ад вуліцы Моладзевай да аўтамагістралі Менск — Мікашэвічы. Па словах Сьвятланы Кругловай, галоўнага архітэктара Салігорскага раёна, на сёньняшні дзень у горадзе няма вольных пляцовак пад жыльлёвае будаўніцтва. Таму быў знойдзены варыянт рашырэньня меж горада на пустуючым абшары.

Ужо пачалося ўзьвядзеньне мікрараёна № 17 і замоўлены праект мікрараёна № 18. У кожным з іх будзе пражываць не меней васьмі тысяч чалавек. У пляне забудовы прадугледжаныя аб'екты сацкультбыта і гандлю, падземныя гаражы і дасуґавыя цэнтры, а таксама міні-аквапаркі. Адмысловая ўвага будзе нададзена азеляненьню. На новых вуліцах зьявяцца рэдкія для нашых краёў расьліны. Праект дэталёвай забудовы новых мікраёнаў распрацоўваўся ў творчых праектных майстэрнях горада Барысава.

Па інфармацыі салігорскай архітэктурнай службы, з цягам часу цэнтар грамадзкага жыцьця горада паступова будзе ссоўвацца ў раён новай забудовы і фармавацца ў раёне вуліцы Моладзевай.

## Горад вар'ятаў маляроў

Хуткімі тэмпамі Салігорск добраўпарадкоўваюць да будучага юбілею. Поўным ходам ідзе папраўка дарог, афарбоўка будынкаў. Горад абнаўляецца, становіцца яшчэ прыгажэйшым. Гэта на першы погляд. А калі капнуць глыбей? Да прыкладу, афарбоўка дамоў. На фарбу ўжо выдаткавана больш 2 мільярдаў рублёў. Рашэньнем гарвыканкама кожнай вуліцы прыстасаваныя свае дамінуючыя колеры. Але іх спалучэньне на кожным асобна ўзятым доме дзівіць безгустоўшчынай. Ужо на ўсю моц жарт ходзіць: «Салігорск – горад вар'ятаў маляроў». Да таго ж, хаты фарбуюцца толькі з боку дарогі каб нацешыць погляды высокапастаўленых службоўцаў, запрошаных на юбілей. У дамах, якім больш паўвеку, мяняюць яшчэ і бальконы. Але, як гавораць жыхары, лепш бы пакінулі старыя, нягледзячы на іх аварыйны стан. Не шматлікім па душы новыя мэталічныя канструкцыі па ўсёй вышыні дамоў з бэтонавымі плітамі на кутках.

Калі раней бальконы былі паасобнымі, то зараз сумешчаныя, што выклікае вызначаныя нязручнасьці жыхарам. Да таго ж сама рэканструкцыя выкананая няякасна.

А ўзяць дарогі: новае дыхтоўнае палатно абклалі, аднак разьметку нанесьці «забылі». Няма нават падзяляльнай паласы.

Няўжо ўся фарба сыйшла на абнаўленьне дамоў?

**Дыяна Жураўская**

## У Салігорску гандаль бабуль арганізуюць

Рашэньнем Салігорскага райвыканкама ў Салігорску забаронены гандаль сельгаспрадукцыяй на стыхійных кірмашах.

Узьнікаюць такія «кірмашы», як правіла, у ажыўленых месцах каля гарадзкіх крам. Для таго, каб даць магчымасьць грамадзянам рэалізоўваць сельгаспрадукцыю, выгадаваную на сваіх прысядзібных участках, адведзеныя спэцыяльныя месцы на рынках "Калгасны" і "Кастрычніцкі", дзе будуць працаваць неабходныя службы, кантралюючыя якасьць тавара. Да парушальнікаў будуць ужывацца штрафы і іншыя меры адміністрацыйнага ўзьдзеяньня.

## Людзям — волю! Жывёлам прыроду!

Ужо традыцыяй стала штогадовае разьмяшчэньне ў цэнтры горада Салігорска цыркаў, заапаркаў...
Аб тым як ставяцца да жывёл ў гэтых стала вандруючых «табарах» гаварылася шмат, але людзі абвыклі зачыняць на гэта вочы, людзям цікава само «судачыненьне» з прыродай, убачыць тое, што ў рэальнасьці бяз кратаў і дрэсіроўшчыкаў яны абыходзілі б далёка бокам. Каго ў гэтым вінаваціць? Пытаньне якое застаецца без выразнага адказу...адзінае, што зразумела ўжо зараз гэта тое, што рабіць забаўку з нечай няволі (нават зьвярынай) не зьяўляецца праявай людзкасьці...
Мабыць гэта ўзрушыла групу маладзёнаў да дзеяньняў, якія 9 ліпеня зьявіліся поруч уваходу ў заапарк. Прыкладна паўтара дзесятка чалавек разгарнулі расьцяжкі з лёзунгамі супраць гвалту над жывёламі.
Гэтак жа яны раздавалі ўлёткі дарослым і паветраныя шары дзецям, якія праходзілі міма і выходзілі з-за сьценкаў заапарка.
Прыкладна праз чвэрць гадзіны прапагандыстам прыйшлося рэтыравацца ў сувязі са зьўленьнем у поле зроку міліцыі.
Магчыма ў будучага пакаленьня ёсьць шанец на годнае суседства з прыродай, на якое пакуль яшчэ ня здольна цяперашняе...

**Паводле esoligorsk.net**

## У Салігорску затрымалі маладафронтаўцаў

9 жніўня , з самае раніцы блізу 10 супрацоўнікаў міліцыі і службы аховы затрымалі 4 актывістаў моладзевага руху, сярод якіх Ільля Шыла, Андрусь Тычына і Барыс Пархамчук. Маладзёны вярталіся з маладафронтўскага летніку.
Прычынаю затрыманьня стаўся нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг, што юнакі трымалі ў руках.
Дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі Малады Фронт лічыць супрацьзаконымі, бо нацыянальны штандар ня ёсьць забароненай сымболікій і не мусіць рэгістравацца. Міліцыянты ўжывалі ў дачыненьні да затрыманых фізычную сілу. Яшчэ адным парушэньнем заканадаўства ёсьць ужываньне спэцсродкаў-кайданкоў у дачыненьні да непаўнагодых Тычыны і Шылы.
Праз некалькі гадзінаў усіх затрыманых вызусьцілі без складаньня пратаколаў.

**Прэс-служба Салігорскага МФ**

## Затрыманьне маладзёнаў у Слуцаку

Сёньня а палове дзявятай раніцы ў Слуцаку ля ганку райвыканкаму былі затрыманыя моладзевыя актывісты партыі БНФ. Сярод затрыманых сябра БНФ Віталь Амяльковіч, які і паведаміў падрабязнасьці інцыдэнту.
Як высьветлілася, маладзёны распаўсюджвалі сярод слуцкага чынавенства буклеты "Што Эўразьвяз можа даць Беларусі?", але ўжо праз паўгадзіны яны былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі ўзброенымі аўтаматамі. Маладзёнаў даставілі ў пастарунак, дзе перапісалі іх дадзеныя і пасьля ўзгадненьня з вышэйшым кіраўніцтвам, хлопцаў адпусцілі.
Вызваліўшыся маладзёны працягнулі распаўсюд інфармацыйных буклетаў ля выканкаму.

**Прэс-служба Салігорскага МФ**

## Як забараняюць пікеты пратэсту ў Салігосрку




Салігорскі райвыканкам вызначыў для мітынгаў і пікетаў адзінае месца. Але тамака практычна нічога правесьці немагчыма – тэрыторыя занятая. Дураць дэмакратаў, але так, што не падкапацца. Гаворка ідзе аб гарадзкім стадыёне «Будаўнік», дзе то спаборніцтвы, то трэніроўкі розных сэкцый, футбольнай каманды «Шахтар», то заняткі па фізкультуры дзятвы з бліжэйшых школ, вучэльняў. Таму ўсе заяўкі мясцовых дэмакратаў службоўцы адфутбольваюць з фармулёўкай: «забараніць з прычыны правядзеньня на стадыёне мерапрыемства».
– *Сапраўды, стадыён загружаны,* – распавядае начальнік аддзела па фізычнай культуры, спорту і турызму райвыканкама **А. Малаш**.
– *Падаць вам загадзя графік, у якія дні ён заняты, а ў якія няма – не атрымаецца. Таму што часта заяўкі на правядзеньне тамака трэніровак паступаюць у дзень трэніроўкі.*
Гэта характэрна, да прыкладу, для футбольнай каманды «Шахтар».
Натуральна, адмяняць нечыя спартовыя заняткі дзеля збору пратэстна настройных грамадзян начальнік аддзела па фізкультуры і спорту ня будзе. Не дазволіць і вышэйстаячае кіраўніцтва. Тым больш, той жа «Шахтар» за арэнду поля плаціць, па словах А. Малаша, прыстойныя грошы. А пры зрэзаным фінансаваньні фізкультуры і спорту – гэта вельмі важна. Але што ж рабіць грамадзянскім актывістам? Зьбіраць народ на несанкцыянаваныя мітынгі? Усё ведаюць, як гэта сёньня накладна, прынамсі для кішэні ўдзельнікаў. У выніку лідэры мясцовага дэмакратычнага руху пазьбягаюць пакуль зьбіраць людзей на пляцах.
– *Будзем дамагацца іншага месца,* – гаворыць адзін з кіраўнікоў кампаніі «За вольнае разьвіцьцё прадпрымальніцтва» **Аляксандар Цэцура**. – *Ушчэмленыя законныя правы грамадзян.*
З іншага боку, рэальная адсутнасьць месца для правядзеньня мітынгаў і пікетаў падштурхоўвае людзей да несанкцыянаваных дзеяньняў. Сама ўлада і падштурхоўвае. Усіх жа усё роўна на спалох ня ўзяць.
Пакуль салігорскі дэмакратычны актыў зьбіраецца адправіць пісьмовыя звароты з патрабаваньнем вырашыць гэтае пытаньне як да мясцовай улады, так і вышэй, у тым ліку і ў МУС, КДБ.

## Ганебная хвароба багатага горада



У Салігорску ўсё часьцей сустракаюцца выпадкі захворваньня каростай – хваробай зусім не сучаснай. Здавалася б, у наш час пры наяўнасьці ўсіх выгод цывілізацыі пра яе можна і забыць. Прынамсі ў гарадох. Аднак дагэтуль людзі зьвяртаюцца да лекара са скаргамі на сьверб і сып. У 2006 годзе зафіксаваны 91 выпадак гэтага захворваньня. У першым паўгодзьдзі гэтага года адпаведны дыягназ пастаўлены 36 жыхарам рэгіёна.
Гэта калі лічыць тых, хто зьвярнуўся ў КВД.
Але шматлікія аддаюць перавагу да лекараў не зьвяртацца – лечацца дома, балазе ўсе неабходныя мазі можна купіць без рэцэпту ў любым аптэчным пункце.
Асноўных чыньніка самалячэньня як правіла два: людзям альбо сорамна зьвяртацца з такой хваробай (што ні гавары, а ў шматлікіх яна дагэтуль асацыюецца з брудам і галечай), альбо проста ня бачаць у гэтым сэнсу. Мазьзю можна нашмаравацца дома, і ездзіць нікуды ня трэба.
Больш іншых схільныя захворваньню дзеці. Тлумачыцца гэта тым, што ў іх скура далікатней, чым у дарослых.
Гаворыць загадчык аддзяленьнем Салігорскага скурна-вэнэралягічнага дыспансэра **Ўладзімір Хаценок**:
– *Улічваючы спэцыфіку распаўсюджваньня каросты, схільныя ёй усё. Пры першых прыкметах лепш адразу зьвярнуцца да лекара-дэрматолягу. І, вядома, не займацца самалячэньнем. Звычайна аматары апошняга спыняюць барацьбу з хваробай пасьля таго, як мінулі зьнешнія прыкметы. Сам жа узбуджальнік каросты – каросьлівы клешч загінуць не пасьпявае. І праз вызначаны час усё пачынаецца зноўку. Толькі вось потым вылечыцца ўжо значна складаней.*

**Дыяна Жураўская**
**Пераклад з расейскай saligorsk.org**

## АБСЭ назвала Беларусь адным з найбольш жорсткіх цэнзараў у Інтэрнэце

У адмысловай справаздачы АБСЭ, агучанай у пятніцу ў Вене, выказваецца заклапочанасьць у зьвязку з ростам дзяржаўнага кантролю над Інтэрнэтам.
Сярод краінаў, якія найбольш жорстка перасьледуюць свабоду слова ў сеціве, называюцца Кітай, Іран, Маляйзія, Грузія, Казахстан, Судан і Беларусь.
"Нядаўнія захады супраць свабоды слова на Інтэрнэце ў шэрагу краінаў нагадваюць, зь якой палёгкай некаторыя рэжымы, як дэмакратычныя, так і дыктатарскія, спрабуюць заглушыць меркаваньні, зь якімі яны нязгодныя, якія ім не да спадобы і якіх яны баяцца.
Пакуль не зьявіўся Інтэрнэт, нідзе і ніколі нельга было выказвацца так свабодна", гаворыцца ў справаздачы АБСЭ. "Але ў той жа час мы бачым, як хутка распаўсюджваецца цэнзура ў Інтэрнэце".

## Лукашэнка: «Анархію ў Інтэрнэце варта спыніць»



Кіраўнік дзяржавы лічыць, што прыйшоў час заканадаўча вызначыць статус электронных СМІ. Пра гэта заявіў Аляксандар Лукашэнка падчас наведваньня рэдакцыі «Советской Белоруссии».
Кіраўнік дзяржавы мяркуе, што трэба заканадаўча вызначыць статус электронных СМІ.
**«Трэба прымаць закон і прапісаць у ім статус электронных СМІ. (...) Такая практыка ёсьць ў многіх дзяржавах. Анархію ў Інтэрнэце трэба спыняць»**
Прэзыдэнт мяркуе, што нельга дапускаць, каб найвялікшае тэхнічнае дасягненьне чалавека ператваралася ў памыйку.

**Паводле БелТА**

## Вышэйшыя афіцэры МУС і КДБ і іх жонкі больш ня патрапяць у ЗША

Дзярждэпартамэнт ЗША абмежаваў выдачу візаў для новых катэгорый беларускіх чыноўнікаў, а таксама іхных жонак і мужоў. У сьпіс увайшлі афіцэры КГБ і МУС у званьні вышэй за падпалкоўніка, супрацоўнікі ідэалягічных аддзелаў, члены выбарчых камісій.
7 жніўня пасольства ЗША распаўсюдзіла прэс-рэліз, у якім паведаміла наступнае.
«Праз год пасля прыняцця Прэзідэнтам Бушам Пракламацыі 8015 адносна Беларусі рэжым Аляксандра Лукашэнкі працягвае практыку зняволення і пераследу грамадзян за выказванні ў абарону дэмакратыі, правядзенне мірных дэманстрацый і выступленні супраць рэпрэсіўнай палітыкі рэжыму
Нягледзячы на тое, што мінулай вясной мела месца некаторае аслабленне рэпрэсіўных мераў, на працягу апошніх некалькіх тыдняў мы сталі сведкамі чарговага пагаршэння сітуацыі з правамі чалавека і дэмакратыяй у Беларусі.
У адпаведнасці з вышэйазначаным, Дзярждэпартамент ЗША выдаў абноўленае распараджэнне ад 3 жніўня 2007 года, якое ўдакладняе катэгорыі асобаў, чые звароты па візы аўтаматычна становяцца аб'ектам спецыяльнага разгляду, як таго патрабуе Прэзідэнцкая Пракламацыя 8015. Пракламацыя, выдадзеная 15 мая 2006 года, прыпыняе ўезд у Злучаныя Штаты па іміграцыйных ці неіміграцыйных візах асобаў, адказных за палітыку альбо дзеянні, што пагражаюць працэсу пераходу да дэмакратыі ў Беларусі.
Згодна з абноўленым візавым распараджэннем, цяпер аб'ектам працэдур, вызначаных Прэзідэнцкай Пракламацыяй 8015, становяцца візавыя звароты наступных асобаў:

- чыноўнікаў узроўню намеснікаў міністраў і вышэй альбо прыроўненых да іх;
- генеральнага пракурора і яго намеснікаў;
- афіцэраў Міністэрства ўнутраных спраў у званні вышэй за падпалкоўніка;
- афіцэраў КДБ Беларусі ў званні вышэй за падпалкоўніка;
- супрацоўнікаў ідэалагічных аддзелаў Мінскага гарадскога і абласных выканкамаў;
- кіраўніка і намеснікаў кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта;
- членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі;
- старшынь абласных выбарчых камісій;
- старшынь абласных і раённых судоў;
- старшыні Канстытуцыйнага суда;
- дырэктараў і намеснікаў дырэктараў дзяржаўных прадпрыемстваў;
- сужэнцаў пералічаных вышэй асобаў».

**Паводле Нашай Нівы**

## Беларусь пачне здабычу вугалю і жалезных рудаў

Аляксандар Лукашэнка ўхваліў адпаведныя прапановы прэм'ера Сідорскага.
У Беларусі падрыхтавана ўрадавая праграма выкарыстання мінеральна-сыравіннай базы краіны. Аб прадугледжаных гэтай праграмай праектах прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку сёння далажыў прэм'ер-міністр краіны Сяргей Сідорскі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА у прэс-службе кіраўніка дзяржавы.
У прыватнасці, у Беларусі прадугледжваецца атрымліваць паліва з бурага вугалю. Паводле слоў прэм'ера, цяпер на тэрыторыі краіны завершана разведка радовішчаў бурага вугалю агульным аб'ёмам 150 млн.т. Быў падрыхтаваны праект, які прадугледжвае магчымасць атрымання паліва з бурага вугалю метадам сінтэзавання. Паводле ацэнак экспертаў, пры існуючым рэсурсе можна атрымліваць да 500 тыс.т паліва ў год.
Гэта вельмі высокатэхналагічны праект, аналагаў якому ў свеце — адзінкі, адзначыў Сяргей Сідорскі. Кошт праекта перасягае $2 млрд. Цяпер урад Беларусі займаецца пошукам інвестараў для яго рэалізацыі.Прэм'ер-міністр таксама далажыў прэзідэнту аб праектах па распрацоўцы сланцавых і жалезных руд. Кіраўнік дзяржавы адобрыў усе тры праекты, якія павінны быць рэалізаваны ў бліжэйшыя гады.

## З Днём Незалежнасьці!



«Прайшло ўжо 17 гадоў, і цяпер усё больш усведамляеш, што заявіць пра сваю незалежнасць у 1990 годзе — гэта было вельмі годным крокам», — заявіў у інтэрв'ю БелаПАН вядомы палітык Станіслаў Шушкевіч, лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычай Грамады.
Ён лічыць, што гэта другая па значнасці дата ў сучаснай гісторыі Беларусі пасля 25 жніўня 1991 года, калі на экстранай сесіі Вярхоўнага Савета Дэкларацыі была дадзена сіла канстытуцыйнага закона.
Паводле слоў палітыка, ён рады, што і сам меў дачыненне да падзей 27 ліпеня 1990 года (з мая 1990 года па верасень 1991 С.Шушкевіч займаў пасаду першага намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.).
Лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка таксама лічыць, што 27 ліпеня — гэта адна з найважнейшых дат пабудовы незалежнай дзяржавы. Паводле яго слоў, «27 ліпеня быў зроблены гістарычны юрыдычны і палітычны крок для адраджэння беларускай незалежнасці».

## Конкурс малюнкаў 27 ліпеня. Фотарэпартаж





27 ліпеня Салігорскі Малады Фронт арганізаваў конкурс малюнкаў крэйдамі на асфальце.Імпрэза прысьвечана 17 угодкам абвешчаньня Незалежнасьці нашае краіны.Мерапрыемства набывае статус штогадовага.
Ад мінулага разу, сёньняшні конкурс розьніўся адсутнасьцю затрыманых і большай колькасьцю гледачоў і удзельнікаў.
Тым ня менш, уражвала колькасьць супрацоўнікаў міліцыі, што прысутнічала на цалкам мірным мерапрыемстве.
Таксама ў раёне правядзеньня конкурсу малюнкаў было заўважана кіраўніцтва салігорскага КДБ і міліцыі.
Мерапрыемства прайшло цалкам пазытыўна, за выключэньнем непрыемнай сутычкі зь міліцыяй на самым пачатку: міліцыянты не дазволілі маладзёнам разгарнуць расьцяжку.
Удзельнікі выкарыстоўвалі пераважна крэйды белага і чырвонага колеру, нацыянальных колераў Беларусі, што адпавядала мэце і зьместу конкурс. На асфальце ў самым цэнтры зьявіліся выявы гэрба "Пагоня" і нацыяльнага сьцягу, не абышлося і без актуальных палітычных лёзунгаў.
Мерапрыемтсва выклікала вялізарную цікавасьць з боку салігорцаў, большасьць зь іх станоўча выказвалася аб такога кшталту мерапрыествах для моладзі.
Прадстаўнікі ўладаў у сваю чаргу цікаваліся тварамі ўдзельнікаў, гледачоў, асабліва гэта тычылася моладзьдзі са значкамі: усе дзеяньні фіксаваліся на камэру.
Па заканчэньні былі вызначыныя лепшыя працы, міліцыя склала пратакол за нібыта "шкоду гораду" на арганізатараў і выклікала супрацоўнікаў ЖКГ. Праз гадзіну ўсе малюнкі былі зьнішчаныя.

**Больш падрабязны фотарэпартаж глядзіце на www.fota.saligorsk.org**

**Прэс-служба Салігорскага МФ**

## На 1 верасьня заплянаваны рэспубліканскі страйк ІП

На **27 жніўня** заплянавана правядзеньне ўстаноўчага збору рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня **«За вольнае прадпрымальніцтва».**
Як паведаміў БЕЛАПАН лідэр кампаніі «За вольнае прадпрымальніцтва» **Віктар Гарбачоў**, акрамя арганізацыйных пытаньняў, датычных стварэньня грамадзкай арганізацыі, удзельнікі збору абгавораць пытаньне аб правядзеньні рэспубліканскага страйку.
Нагадаем, што з ініцыятывай пачаць **1 верасьня** страйк з нявыплатай падаткаў выступілі індывідуальныя прадпрымальнікі (ІП) Сьветлагорска (Гомельская вобласьць).
Як растлумачыў **В. Гарбачоў**, нагодай для рашэньня аб правядзеньні акцыі пратэсту сталі пачасьцiўшыяся масавыя праверкі дзейнасьці ІП з канфіскацыяй тавараў і накладаньнем буйных штрафаў.
*«У апошнія два тыдня адбываецца поўнае бязьмежжа, у людзей забіраюць усе, што яны зарабілі, і вязуць у крамы канфіската»,—* распавёў **У. Гарбачоў.**
У прыватнасьці, па яго словах, 10 жніўня па гэтым чыньніку фактычна была спыненая праца рынку ў Слуцку (Менская вобласьць). Прадпрымальнікі запрасілі прадстаўнікоў мясцовай улады абгаварыць стварыўшуюся сытуацыю. *«Ім атрымалася спыніць канфіскацыю тавара, але прадпрымальнікі заявілі, што ў выпадку наступных рэпрэсій абвесьцяць страйк»,—* адзначыў лідэр кампаніі.
Ён таксама паведаміў аб інцыдэнце, які меў месца 8 жніўня падчас сустрэчы ІП з уладамі Пінска (Брэсцкая вобласьць). *«Прадпрымальнікі папрасілі выступіць рэгіянальнага лідэра кампаніі „За вольнае прадпрымальніцтва“ Аляксандра Васільева, аднак яму не толькі не далі слова, але і выклікалі міліцыю»,—* распавёў У. Гарбачоў.
Аднак ужо на наступны дзень у актывіста пачаліся праблемы: яго выклікалі ў міліцыю, даслалі позву ў суд, абвінавацілі ў спробе арганізаваць несанкцыянаваны мітынг.
*«Праверкі вядуцца ня толькі на рынках, але і на мяжы»,—* адзначыў У. Гарбачоў. Так, па яго словах, 9–10 жніўня ў Воршы (Віцебская вобласьць) мінула масавая праверка і канфіскацыя тавара ў прадпрымальнікаў. *«Людзі ў чорных масках спынялі аўтобусы, правяралі тавар на наяўнасьць сэртыфікатаў, адбіралі яго. Усё гэта здымалася на відэакамэру»,—* распавёў **У. Гарбачоў.**
*«Так больш ня можа працягвацца. На гэтай хвалі прадпрымальнікі з усіх рэгіёнаў кансалідуюцца. Мы будзем прымаць ахоўныя меры ў рамках Канстытуцыі аж да страйкаў»,—* канстатаваў лідэр кампаніі.
Па яго словах, аб падтрымцы акцый пратэсту ўжо заявілі прадстаўнікі 18 гарадоў краіны, дзе быў адзначаны ўсплеск праверак з масавай канфіскацыяй тавараў.

**Паводле БЕЛАПАН**

## “Малады фронт” пад крымінальным перасьледам

Дванаццатую па ліку крымінальную справу за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі перадалі днямі ў суд. Дзевяць з дванаццаці крымінальных спраў улады распачалі супраць актывістаў “Маладога фронту”. Шэсьць чалавек судзілі. Лідэра арганізацыі **Зьмітра Дашкевіча** пакаралі зьняволеньнем на паўтара года, а пяцёх актывістаў – штрафамі. У верасьні пачнуцца суды ў Салігорску, Баранавічах і Нясьвіжы.

Актывісты незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” **Іван Шыла, Наста Азарка і Яраслаў Грышчэня** ў хуткім часе паўстануць перад судом. Іх абвінавачваюць ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт”.

Маладафронтаўцы лічаць, што спроба ўладаў зьнішчыць арганізацыю і запалохаць прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў сярод моладзі выклікала адваротную рэакцыю. Колькасьць сяброў “Маладога фронту” ды іншых моладзевых арганізацый павялічылася.

Пасьля таго, як лідэра арганізацыі **Зьмітра Дашкевіча** пакаралі зьняволеньнем на паўтара году, пачаліся штомесячныя вулічныя акцыі ў абарону маладафронтаўца, якія ладзілі сябры розных моладзевых супольнасьцяў.

Напрыканцы траўня ў Менску судзілі пяцёх актывістаў “Маладога фронту”: **Насту Палажанку, Барыса Гарэцкага, Зьмітра Хведарука, Аляксея Янушэўскага і Алега Корбана**. Суд адбываўся ў той момант, калі вырашалася пытаньне пра гандлёвыя прэфэрэнцыі для Беларусі. На думку назіральнікаў, гэта паўплывала на рашэньне ўладаў – і “пяцёрку” пакаралі толькі штрафамі.

Напярэдадні суду ў КДБ і пракуратуру пачалі выклікаць дзясяткі чалавек дзеля паказаньняў у новых крымінальных справах. Гэтым разам – супраць рэгіянальных актывістаў.

Непаўналетняга **Івана Шылу**, які вучыцца ў Салігорскай сярэдняй школе, будуць судзіць першым.

*“Калі мае аднаклясьнікі даведаліся, што нада мной будзе адбывацца суд, то паабяцалі: абавязкова прыйдзем на суд і будзем усяляк цябе падтрымліваць. Ніводзін з маіх аднаклясьнікаў, сяброў у школе не сказаў, што ня трэба было займацца гэтым, бо такое мае пэўныя наступствы. Зусім наадварот”.*

Крымінальныя справы супраць **Насты Азаркі** ў Нясьвіжы і **Яраслава Грышчэні** ў Баранавічах днямі накіравалі ў суды. Цягам месяца стане вядомы дзень судовых паседжаньняў.

**Барыс Гарэцкі** лічыць, што судовыя працэсы ёсьць PR-кампаніяй “Маладога фронту”.

*“Ніводнага такога выпадку, каб адмоўны рэйтынг ствараўся праз крымінальную справу, яшчэ не было. Наадварот: кожны такі публічны суд, калі маладыя людзі не баяцца браць на сябе адказнасьць, яшчэ больш прыцягвае да нас увагу. Таму тое, што робіць Камітэт дзяржбясьпекі, – хіба што PR-кампанія моладзевага руху...”*

**Аляксандар Мілінкевіч** мяркуе: зьнішчэньне моладзевай арганізацыі ня мае пэрспэктывы.

*“Таталітарная ўлада ніколі ня мае добрай будучыні. Ня можа яна доўга існаваць. Тым больш – у сучасным сьвеце. Сымбалем будучыні зьяўляецца моладзь, і ўлада прайграла гэтую моладзь. Чым больш будзе рэпрэсій, тым лепш будуць гуртавацца шэрагі “Маладога фронту” ды іншых арганізацый. “Малады фронт” насамрэч – самы актыўны, самы бачны. Ягоныя шэрагі павялічваюцца. Беспэрспэктыўна сілай зьнішчаць дух. Дух непераможны”.*

Маладафронтаўцы заявілі, што будуць як мага часьцей ладзіць акцыі салідарнасьці са сваімі паплечнікамі ў Менску і рэгіёнах. Крымінальныя справы яны разглядаюць як праяву страху ўладаў перад актыўнай моладзьдзю. Асабліва – напярэдадні 6 верасьня, калі “Маладому фронту” споўніцца 10 гадоў.

**Любоў Лунёва, Менск**

## Цяпер у Беларусі можна тэлефанаваць і на таксафоны

Філіял «Менская гарадзкая тэлефонная сетка» РУП «Белтэлекам» увёў у досьледную эксплюатацыю паслугу «Ўваходная сувязь на таксафон».

Неабходная такая паслуга паўсюль, дзе няма стацыянарнага тэлефона.

З такога таксафона менчукі могуць самі набраць сваякоў, сяброў і папрасіць іх перазваніць, ці могуць дамовіцца, што ў пэўны час падыдуць да таксафона і будуць чакаць званка.

У Менску ўваходныя званкі могуць прымаць 133 з 4590 таксафонаў. Над таксафонамі з уваходнай сувязьзю разьмешчаныя налепкі «Таксафон з уваходнай сувязьзю» і ягоны нумар.

Адрасы і нумары такіх таксафонаў можна даведацца на сайце МГТС і па даведцы 130. Аплочвае паслугу той, хто тэлефануе на таксафон, па такіх самых тарыфах, што і для звычайнага тэлефона. Тэлефанаваць можна і з мабільных тэлефонаў па тарыфах свайго апэратара.

## БАТЭ замацоўвае пазыцыі

Шаснаццаты тур чэмпіянату Беларусі па футболе, якія прайшоў у выходныя, стаў адметны замацаваньнем на першай пазыцыі барысаўскага БАТЭ.

Чэмпіён у суботу дома прымаў «Віцебск». Былі перасьцярогі, што БАТЭ не пасьпее як сьлед узнавіць сілы пасьля матчу Лігі чэмпіёнаў зь ісьляндзкім «Хафнаф'ёрдзюрам». Аднак барысаўцы паказалі вясёлы атакуючы футбол і заслужана перамаглі – 4:1. Два галы забіў упершыню выкліканы ў зборную нападнік Віталь Радзівонаў.

У цэнтральным матчы туру МТЗ-РІПА падзяліла пункты з «Гомелем». На гол менчука Афанасьева адказаў Стрыпейкіс – 1:1.

Салігорскі «Шахцёр» упэўнена перайграў наваполацкі «Нафтан» – 3:1. Менскае «Дынама», хоць і панэрвавалася ў канцоўцы гульні, але ўзяло тры пункты ў матчы з «Дарыдай» – 2:1.

Астатнія матчы туру прынесьлі наступныя вынікі: «Нёман» – «Смургоні» 0:1, «Дняпро» – «Дынама» (Берасьце) 3:1, «Менск» – «Тарпэда» 0:0.

Турнірная табліца пасьля шаснаццаці тураў выглядае наступным чынам: БАТЭ – 36 пункты, МТЗ-РІПА – 30, «Гомель» - 26, «Тарпэда», «Шахцёр» - па 25, «Нёман» - 23, «Смургоні», «Дынама» (Менск) – па 21, «Віцебск» - 20, «Нафтан» - 19, «Дынама» (Берасьце), «Дняпро» – па 14, «Менск», - па 12, «Дарыда» - 10.

Найлепшы бамбардзір Раман Васілюк («Гомель») – 17 галоў.

**Зьміцер Панкавец , Наша Ніва**

## Ці чакае палітзьняволеных амністыя?

Пытаньне аб абвяшчэньні чарговай амністыі будзе разгледжана на восеньскай сэсіі палаты прадстаўнікоў.

Пра гэта ў чацьвер падчас он-лайн канфэрэнцыі заявіў міністар унутраных справаў Беларусі **Уладзімер Навумаў.** Паводле ягоных словаў, «рашэньне ад абвяшчэньні амністыі будзе разглядаць парлямэнт падчас будучай сэсіі таму, бо ўвесну гэта не атрымалася зрабіць таму, што не ўсе зацікаўленыя бакі змаглі абмеркаваць умовы вызваленьня зьняволеных».

Тым час у беларускіх турмах за палітычную дзейнасьць па-ранейшаму знаходзяцца лідэр незарэгістраванага Маладога Фронту **Зьміцер Дашкевіч** і экс-кандыдат на пасаду прэзыдэнта **Аляксандар Казулін**, які быў асуджаны на пяць з паловаю год зьняволеньня за нібыта арганізацыю масавых беспарадкаў у Менску. Акрамя гэтага, Камітэтам дзяржаўнай бясьпекі быў распачаты шэраг крымінальных справаў супраць моладзевых актывістаў, якія ўжо цяпер рызыкуюць патрапіць за краты.

## Іх адказ Дзяржэдэпу

Паўлу Севярынцу не паставілі ў пашпарт штамп для выезду за мяжу.

Павал зьвярнуўся ў аддзел грамадзянства і міграцыі Першамайскага раёну Віцебску яшчэ 23 ліпеня. Паўтара месяцы яму абяцалі, што хутка ўсё аформяць і вернуць дакумэнт. Але сёньня яму адмовілі.

## У ЗЭЛЬВЕ ЎШАНАВАЛІ ПАМЯЦЬ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

Гарадзенская моладзь 11 жніўня слухала ў зэльвенскай Свята-Траецкай царкве малебен за Ларысу Геніюш. Сьвятар чытаў літургічную частку малебну па Эвангельлі, якое падырыла царкве ў савецкія часы Ларыса Геніюш.
У Сьвята-Траецкай зэльвенскай царкве сёньня пераважна гарадзенская моладзь, некалькі мясцовых жыхарак ды хор. Каля помніка Ларысе Геніюш – кветкі. У чацьвер ёй споўнілася б 97 гадоў.
У невялічкай царкве – цішыня, усе слухаюць і маўчаць, як сьвятар чытае малебен па-расейску. У сёньняшнім казаньні да прыхажан ён шмат узгадваў пра бязбожнікаў Маркса і Леніна, назваў іх сатаністамі. Было цікава гэта слухаць, бо яшчэ некалькі хвінаў таму я праходзіў па цэнтральнай плошчы Зэльвы, дзе стаіць помнік таму самаму Леніну.
Потым усе арганізавана накіраваліся на могілкі, дзе таксама чыталі малітву каля помніку Ларысе і Янку Геніюшам. Моладзь фатаграфавалася побач з помнікам пад бела-чырвона белымі сьцягамі.

**Прэс-служба МФ**

## Імпрэзу руху "За Свабоду" спыніў спэцназ міліцыі

Цягам 11 жніўня ў арэндаваным на дзень летніку адпачынку пад Менскам ладзілася імпрэза пад назвай "Вялікі пікнік руху "За Свабоду".
Мэта імпрэзы – знаёмства сябраў руху між сабою, дыскусіі і адпачынак. Цэлы дзень больш за 300 чалавек бралі ўдзел як у сустрэчах з экспэртамі грамадзка-палітычнай дзейнасьці, гэтак у забаўляльных мерапрыемствах. Напрыканцы адбыўся канцэрт, які склаўся з выступаў Касі Камоцкай ды гуртоў "Рэха" і "Сьцяна".
Пад вечар прыбылі супрацоўнікі менскай раённай міліцыі, якія выклікалі міліцэйскі спэцназ. Падстава – "забарона на масавыя мерапрыемствы пасьля 22-й гадзіны". Аргумэнты лідэра руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча, што прыватная імпрэза пасярод лесу не вымагае дазволу, не былі прынятыя да ўвагі.

**Севярын Квяткоўскі, Менск**

## БХК: Ня трэба ставіць у адзін шэраг РНЕ і "Малады фронт

Рэспубліканскае праваабарончае грамадзкае аб'яднаньне "Беларускі Хэльсынскскі камітэт" (БХК) расчараванае рашэньнем гомельскага суду аб арышце на шэсьць месяцаў аднаго з каардынатараў Рускага нацыянальнага адзінства (РНЕ) у Беларусі Міхася Якаўчука за "арганізацыю дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, не атрымаўшага ва ўсталяваным парадку дзяржаўную рэгістрацыю" (артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса Беларусі). Аб гэтым гаворыцца ў заяве БХК.
Нагадаем, па інфармацыі прэс-групы кіраваньня КДБ па Гомельскай вобласьці, пасьля папярэджаньня аб недапушчальнасьці супрацьпраўных дзеяньняў "М.Якаўчук дадзеную дзейнасьць не спыніў, а наўмысна працягваў яе ажыцяўляць: выраблеў навочную агітацыю, распаўсюджваў увезеную з Расеі друкаваную прадукцыю, якая прапагандуе ідэі і лёзунгі РНЕ, настойліва спрабаваў далучыць у шэрагі арганізацыі жыхароў горада".
"БХК лічыць, што дзейнасьць груп і асоб, накіраваная на ўзрушанасьць расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасьці або розьні, на зьняважэньне нацыянальнага гонару і вартасьці, мае прыкметы злачынства, прадугледжанага артыкулам 130 Крымінальнага кодэкса - "распальваньне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай варожасьці або розьні", - гаворыцца ў заяве арганізацыі.
Пры гэтым, як адзначаецца ў дакумэньце, БХК па-ранейшаму лічыць, што сама па сабе дзейнасьць нефармальных аб'яднаньняў не павінна быць крымінальна каральнай, калі яна не наносіць шкоды грамадзтву і не парушае правы грамадзян. Праваабаронцы настойваюць на прызнаньні артыкула 193-1 УК неканстытуцыйным.
Беларускі Хэльсынскскі камітэт лічыць непрымальнай пастаноўку ў адзін шэраг прафашысцкіх арганізацый і мірных моладзевых ініцыятыў .

**Паводле tut.by**

## У верасні будзе пераразлік пенсій



Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз "облагодетельствует" пенсіянераў - восенню плануецца падняць пенсіі.
Зараз Савет міністраў рыхтуе праект Указа, які прадугледжвае павышэнне ў верасні пенсій не менш чым на 7 працэнтаў. Менавіта такое даручэнне даў прэм'еру Сяргею Сідорскаму Лукашэнка падчас рабочай сустрэчы.
Сам Сяргей Сідорскі паведаміў, што ў жніўні сярэдні памер пенсіі па Беларусі склаў 136 долараў у эквіваленце. У Расіі аналагічны паказчык роўны 131 долару, ва Украіне - 110 доларам.
- Мы, натуральна, па пенсіях наперадзе ўсіх, але гэта зусім не паказчык працвітання, - кажа палітолаг Сяргей Нікалюк. - У той жа Расіі альбо Украіне цэны на тавары куды ніжэйшыя, чым у Беларусі. Да таго ж, зараз пенсіянерам дабавяць гэтыя 7 працэнтаў (калі зыходзіць з сярэдняй зраплаты, то прыкладна - 9,5 долараў альбо 20 тысяч рублёў), але ж ужо ў снежні пазбавяць ільгот. Крыху - дадуць, шмат - адбяруць. Таму ніякага "благодетельства" ў павышэнні пенсій няма. Усім гэта добра зразумела, акрамя, напэўна, саміх пенсіянераў, якія задаволены любым кавалкам з "барского стола".

## Кватэры зноў падаражэюць



Ва ўрадзе Беларусі знаходзіцца на разглядзе рашэнне, паводле якога плануюць адкарэктаваць індэкс цэн на будаўніча-мантажныя працы ў гэтым годзе згодна з узроўнем цэн на цеплаэнерга-рэсурсы. Пра гэта паведаміў учора на прэс-канферэнцыі міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Селязнёў.
"Індэкс цэн на будаўніча-мантажныя працы плануюць павялічыць прыблізна да 12,5-14%", – паведаміў Аляксандр Селязнёў.
Прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2007 год гэты паказчык быў усталяваны на ўзроўні 9,7%, аднак пры яго вызначэнні зыходзілі з цэн на энергарэсурсы, якія дзейнічалі. З пачатку года цэны на энерганосьбіты ўзраслі, але прадпрыемствы Мінбудархітэктуры працуюць у рамках прагнозу.
"Гэта прывяло да таго, што ў некаторых будаўнічых арганізацый нулявая рэнтабельнасць", – канстатаваў міністр.

**Паводле газэты "Пагоня"**

Свабодны Салігорск
незалежная газета Салігорска
Сувязь: 370-02-04 , 370-02-05 , salihorsk@gmail.com , http://gazeta.saligorsk.org
Газэта "Свабодны Салігорск". Адказнасьць за змешчаныя матэр'ялы нясуць аўтары.
Галоўны рэдактар : Жылінскій Я.Т. , Шэф-рэдактар : Рымашэвскій А.Б., Сакратар рэдакцыі : Захарчук А.У. , Галоўны прыбіральшчык : Лімонаў В.К. Надрукавана на асабістым абсталяваньні Пеці Іванова. ; Балгарыя , г.Балычок , вул. героя СССР Драбудзькі М.М., д.13 , корпус 13 , кв. 13

## Дык Падпішыся!



Калі вы жадаеце рэгулярна атрымліваць нашу газэту проста паведаміце свой адрас па тэлефонах :
**8 (029) 370-02-04 , 8 (029) 370-02-05 , 8 (0174) 2-61-371**